■ Спорт-тайм

З ПЕРАМОГАЙ ПАМІЖ АКІЯНАМІ

У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра поспех беларускай спартсменкі на прэстыжным ультрамарафоне, развязку баскетбольнага чэмпіянату краіны і вынікі трэцяга тура футбольнага першынства Беларусі.

1. Марына Даманцэвіч стала пераможцай аднаго з самых знакамітых ультрамарафонаў у свеце «Два акіяны», які праходзіць у паўднёваафрыканскім Кейптаўне. Дыстанцыю 56 кіламетраў на трасе паміж Індыйскім і Атлантычным акіянамі беларуска пераадолела за 3 гадзіны 37 хвілін.

2. У чэмпіянаце краіны па футболе адбыліся матчы 3-га тура ў вышэйшай лізе. Наваполацкі «Нафтан» унічыю згуляў з «Віцебскам» — 0:0, футбалісты брэсцкага «Дынама» і барысаўскага БАТЭ таксама не выявілі пераможцу — 1:1. Салігорскі «Шахцёр» у гасцях перайграў «Мінск» — 1:0. Першае паражэнне пацярпеў «Слуцк», які прайграў у Гродне мясцоваму «Нёману» з лікам 1:2. З аднолькавымі лічбамі на табло — 2:0 — скончыліся матчы «Гомеля» з мазырскай «Славіяй» і «Гарадзеі» з «Ісланчу». Магілёўскі «Днепр» перайграў «Крумкачоў» — 2:1, а «Тарпеда-БелАЗ» з мінімальным лікам перамог сталічнае «Дынама» — 1:0.

Пасля трох тураў наперадзе «Шахцёр» і «Нёман», якія набралі па 7 ачкоў. На 1 бал менш у мінскага «Дынама», «Слуцка», «Тарпеда-БелАЗ» і «Дняпра».

3. Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» перамаглі «Ніжні Ноўгарад» у заключным дамашнім матчы Адзінай лігі ВТБ — 77:52. Адзначым, што гэта першая вікторыя на чале з Аляксандрам Круцікавым. У 23 праведзеных сустрэчах мінскія «Цмокі» атрымалі 5 перамог і займаюць цяпер 12-е месца сярод 13 удзельнікаў «банкаўскага» турніру. Свой заключны паядынак «Цмокі» правядуць 23 красавіка ў гасцях у краснадарскага клуба «Лакаматыў-Кубань».

Тым часам жаночая каманда «Цмокі-Мінск» стала чэмпіёнам Беларусі. У трэцім паядынку фінальнай серыі за залатыя медалі дзяўчаты перайгралі саперніц з «Гарызонта» — 60:55. У дзвюх папярэдніх сустрэчах яны таксама былі мацнейшыя — 71:56 і 66:53.

У барацьбе за бронзавыя ўзнагароды поспеху дабілася гродзенская «Алімпія», якая выйграла серыю за 3-е месца ў саперніц з клуба «Гомель-Сож».

4. Беларуская тэнісістка Вольга Гаварцова стала пераможцай турніру ў амерыканскай Індыян Харбар Біч (прызавы фонд — $80 тыс.). У вырашальным паядынку яна перамагла прадстаўніцу ЗША Аманду Анісімаву — 6:3, 4:6, 6:3.

Яшчэ адна беларуска, Аляксандра Сасновіч, якая дайшла да паўфіналу прэстыжнага турніру ў швейцарскім Біле, увайшла ў першую сотню сусветнага рэйтынга, падняўшыся з 108-й на 96-ю пазіцыю. Палепшылі свае радкі ў рэйтынгу WTA яшчэ дзве беларускія тэнісісткі: Арына Сабаленка займае цяпер 125-е месца, Вера Лапко знаходзіцца на 241-м радку.

5. Беларускія хакеісты саступілі зборнай Германіі ў матчы Еўрапейскага хакейнага выкліку ў Бабруйску — 1:2. Адзіная шайба ў нашай камандзе на рахунку Андрэя Касціцына. Нагадаем, у першым матчы Еўравыкліку ў Жлобіне зборная Беларусі была мацнейшая за Германію — 3:1.

Падрыхтоўку да чэмпіянату свету каманда пад кіраўніцтвам Дэйва Льюіса працягне на наступным тыдні, 21 і 22 красавіка нашы хакеісты згуляюць у Гродне са зборнай Швецыі.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Здарэнне

Выкрадзеную машыну хацелі ўтапіць у возеры

— У міліцыю звярнуўся ўладальнік аўтамашыны «ВАЗ 21063», які расказаў, што ўначы быў выкрадзены яго аўтамабіль. Высветлілася, што тры мужчыны (19, 25 і 35 гадоў) каля трох гадзін ночы, знаходзячыся ў адным з двароў, разбіўшы бакавое шкло, ускрылі «Жыгулі», аднак з'ехаць на іх не змаглі, бо ў аўто адсутнічаў акумулятар, — паведаміла **афіцыйны прадстаўнік Цэнтральнага РУУС г. Мінска Таццяна АБОЗНАЯ.** — Мужчыны паспрабавалі ўскрыць «Таўрыю», аднак не змаглі гэта зрабіць, пасля чаго праніклі ў прыпаркаваную недалёка неабсталяваную сігналізацыяй аўтамашыну «ВАЗ 21036», якую ім удалося завесці. На ёй прыяцелі накіраваліся ў Пухавіцкі раён, дзе ў адным з дачных дамоў выкралі тэлевізар, адзенне, алкаголь, музычны цэнтр, карціну, а таксама іншую маёмасць, частку якой прадалі ў Слуцкім раёне. Па дарозе машына зламалася, і мужчыны вырашылі ўтапіць яе ў возеры, аднак зрабіць гэта ім перашкодзілі супрацоўнікі міліцыі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

Даты Падзеі Людзі

18 КРАСАВІКА

Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін (Дзень сусветнай спадчыны). Усталяваны ў 1983 годзе рашэннем Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА па прапанове Міжнароднага савета па захаванні помнікаў і гістарычных мясцін (ICOMOS). Упершыню адзначаўся ў 1984 годзе.

1827 год — нарадзіўся Якуб Станіслававіч Гейштар, адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гадоў і партыі «белых» у Беларусі і Літве. Выступаў супраць Кастуся Каліноўскага і іншых рэвалюцыйных дэмакратаў, якія імкнуліся накіраваць паўстанне па шляху аграрнай рэвалюцыі. У жніўні 1863 года быў арыштаваны і сасланы на катаргу. З 1873 года жыў у Варшаве. Аўтар «Успамінаў 1857—1865 гадоў». Памёр у 1897 годзе.

1838 год — нарадзіўся (маёнтак Адамарын, цяпер у Маладзечанскім раёне) Уладзіслаў Іванавіч Дыбоўскі, беларускі заолаг, мінералог, батанік, палеантолаг, фалькларыст, доктар мінералогіі (1878). За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў быў асуджаны. З 1871 года працаваў на кафедры мінералогіі Дэрпцкага ўніверсітэта, з 1878-га жыў у маёнтку Нянькава на Навагрудчыне. Асноўныя работы па флоры і фаўне возера Байкал. Даследаваў флору і фаўну Навагрудчыны, збіраў беларускі фальклор. Памёр у 1910 годзе.

1887 год — нарадзіўся Анатоль Дзяркач (вёска Турэц, цяпер у Карэліцкім раёне), беларускі паэт, сатырык, гумарыст. Служыў пісарам у Мінскай гарадской і земскай управах. Аўтар кніг сатырычных і гумарыстычных вершаў «Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў», «Усім патроху», паэмы «Міколава гаспадарка». У 1936 годзе арыштаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

1903 год — нарадзіўся (вёска Пабокавічы, цяпер у Бабруйскім раёне) Платон Галавач, беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Быў адным з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк» і БелАПП, рэдактарам газеты «Чырвоная змена», часопісаў «Маладняк» і «Полымя». Аўтар рамана «Праз гады», зборнікаў апавяданняў «Дробязі жыцця», «Хочацца жыць», аповесці «Спалох на загонах», а таксама публіцыстычных і літаратурна-крытычных артыкулаў. У 1937 годзе быў арыштаваны і прыгавораны да расстрэлу. Рэабілітаваны ў 1956 г.

1917 год — нарадзіўся (горад Тэрыёкі, зараз — Зеленагорск, у складзе Санкт-Пецярбурга) Георгій Міхайлавіч Віцын, савецкі і расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст СССР. Кінадэбют акцёра адбыўся ў 1945 годзе ў фільме Сяргея Эйзенштэйна «Іван Грозны». А сапраўдная папулярнасць прыйшла да яго пасля ролі Васі Вяснушкіна ў фільме «Запасны ігрок». Усенародную любоў акцёру прынеслі камедыйныя фільмы Гайдая «Пёс Барбос і незвычайны крос», «Самагоншчыкі», «Аперацыя «Ы» і іншыя прыгоды Шурыка», «Каўказская палонніца, ці Новыя прыгоды Шурыка», у якіх ён з бляскам выканаў ролю Баязліўца. За сваё творчае жыццё Георгій Міхайлавіч зняўся больш чым у 80 абсалютна разнапланавых фільмах.

Было сказана

Марыс МЕТЭРЛІНК,
бельгійскі паэт, драматург, эсэіст:
«Мы валодаем толькі тым шчасцем, якое здольны зразумець».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.02	20.17	14.15
Віцебск —	5.48	20.10	14.22
Магілёў —	5.52	20.07	14.15
Гомель —	5.52	20.00	14.08
Гродна —	6.17	20.31	14.14
Брэст —	6.22	20.28	14.06

Месяц

Апошняя квадра 19 красавіка. Месяц у сузор'і Казерога.

Імяніны

Пр. *Фядоры, Марка, Мікалая, Палікарпа, Платона, Сямёна.* ***К.*** *Аліцы, Апалонія, Багуслава.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— А я ўчора ў акуліста была.

— І што сказаў?

— Сказаў, каб алфавіт вучыла.

Карысныя парады.

Калі завесці дзіця на год пазней за сяброў або сваякоў — будзе на халяву даставацца шмат дзіцячага адзення і іншых карысных штук.

— Сёма, толькі ўчора вы выдалі мне пінжак, а сёння спіна лопнула!

— Вось бачыце! Я ж казаў, што гузікі прышытыя моцна!

«Вось і скончылася дзяцінства...» — падумаў Славік, калі пенсію прынеслі не толькі маме, але і яму самому.

Сяджу ў кавярні. Падыходзіць хлопец і кажа:

— Дзяўчына, можна я за вас заплачу?

Ну, я не разгубілася — дастала квітанцыі за ацяпленне, газ, святло, ваду...

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1479.

Нумар падпісаны ў 19.30 17 красавіка 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12